**Запрудская Д.В.,** студэнт

Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.,

## ГУД П.А. ЯК ЗАСНАВАЛЬНІК ШКОЛЫ РЭЖЫСУРЫ АБРАДАЎ І СВЯТ БДУКМ

Імя Пятра Адамавіча Гуда, рэжысёра масавых свят, стваральніка цэлай школы рэжысуры ў гэтай сферы, аднаго з ініцыятараў і аўтараў адраджэння беларускіх свят, абрадаў, святочных кірмашоў, добра вядома ў нашай культуры. Акцёр, рэжысёр, сцэнарыст, педагог, этнограф, фалькларыст, Пётр Адамавіч Гуд – лаўрэат міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў, святаў і конкурсаў, кандыдат гістарычных навук (1987 г.), прафесар (2000 г.), член Міжнароднай арганізацыі па народнай творчасці (IOV, ЮНЭСКА). Яго дзейнасць на працягу 37 гадоў непарыўна звязана з нашым універсітэтам.

Тэмай з‘яўляецца асэнсаванне творчай спадчыны гэтага дзеяча культуры Беларусі і пастаноўка праблемы аб прызнанні на ўніверсітэцкім узроўні яго школы ў рэжысуры масавых свят. Сёння ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў існуюць пяць навуковых школ: дзве ў галіне педагогікі (“Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства”, “Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці”) адна ў галіне мастацтвазнаўства (“Кампаратыўнаяе мастацтвазнаўства”), адна ў галіне культуралогіі (“Сусветная і айчынная культура”) і адна ў галіне музеязнаўства (“Тэорыя і практыка музейнай справы”). Але пры гэтым наш універсітэт мае вялікі аўтарытэт і высокі рэйтынг дзякуючы, у тым ліку, шырокамаштабнай мастацкай творчасці. А менавіта ў сферы мастацкай творчасці рэалізаваны дасягненні школы рэжысуры масавых свят П.А. Гуда. Таму пытанне аб прызнанні творчай спадчыны гэтага дзеяча культуры як школы з‘яўлецца актуальным і сацыяльна значным.

Пры спробе акрэсліць паняцце школа ў галіне мастацкай творчасці мы сутыкнуліся з нераспрацаванасцю гэтага пытання (у параўнанні з паняццем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковая школа). У якасці рабочага азначэння мы прынялі наступнае: школа ў галіне мастацкай творчасці – гэта супольнасць дзеячоў нацыяльнай культуры, якія рэалізуюць і творча развіваюць у сваёй практычнай і тэарэтычнай дзейнасці каштоўнасныя ўстаноўкі заснавальніка (або заснавальнікаў). Паслядоўнікі школы ў галіне мастацкай творчасці могуць дзейнічаць як у калектыве, так і аўтаномна, транслюючы непасрэдна і ў новых формах прынцыпы, закладзеныя заснавальнікам школы.

У сувязі з гэтым звернем увагу на найбольш істотныя моманты. П.А. Гуд напісаў шмат і сёння працягвае абагульняць свой рэжысёрскі вопыт. Назавем толькі асноўныя працы: “Тэхналогія стварэння свята” (2004, 2008 г.г.), “Мастацтва феерверкаў” (2007 г.), унікальны збор кірмашовых песень у манаграфіі “Беларускі кірмаш” (1996 г.), сборнік сцэнарыяў “Ад Каляд да Пакроваў” (2000. г). Агулам ён аўтар 48 публікацый [3, с. 373–374; 4, с. 293]. Яго практыка як рэжысёра ўвасоблена ў 400 аўтарскіх распрацоўках свят, фестываляў, прадстаўленняў, абрадаў, канцэраў, творчых акцый, сярод якіх 76 міжнародных і ўсесаюзных, 100 рэспубліканскіх, 15 абласных і шмат іншага.

У навуцы таксама прызнаецца ўнёсак Пятра Адамавіча ў развіццё сучаснай святочнай культуры Беларусі. Напрыклад, энцыклапедыя “Беларускі фальклор” (Т.1): “даследуе народную абрадавую творчасць, вытокі свят беларусаў, перспектыўныя кірункі развіцця іх у сучасным культуралагічным кантэксце, новыя формы сучаснай святочнай культуры на народнай аснове. Адзін з ініцыятараў адраджэння беларускіх свят, абрадаў і святочных кірмашоў” [3, с. 373–374]. Такім чынам, ёсць сфармуляваныя каштоўнасныя ўстаноўкі заснавальніка школы і гэтыя ўстаноўкі прызнаныя грамадскасцю.

З 1993 па 2014 гады, як вядома, Пётр Адамавіч загадваў кафедрай рэжысуры абрадаў і свят. У гэты час выкладчыкі і выпускнікі кафедры сталі ініцыятарамі і аўтарамі адраджэння многіх беларускіх народных свят, аўтарамі ідэй ці сцэнарыстамі, членамі рэжысёрска-пастановачных груп новых святочных формастварэнняў, буйных гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных святочных мерапрыемстваў, рэспубліканскіх конкурсаў, фестываляў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маштабных тэатралізаваных прадстаўленняў. У 2008 годзе ён пісаў пра шляхі развіцця сучаснай святочнай культуры і так асэнсоўваў іх: ―захаванне традыцыйных народных свят каляндарнага цыклу” і разам з гэтым ―стварэнне новых святочных формаўтварэнняў на аснове культурна-гістарычнай спадчыны” [1, с. 39]. Гэта пастунова прыводзіла да таго, што сярод вучняў П.А. Гуда з‘явіліся рэжысёры свят розных узроўняў, лаўрэаты і дыпламанты міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, тэатральныя дзеячы, кіраўнікі ўстаноў культуры і адукацыі. У розны час у нашым універсітэце працавалі і сёння працягваюць працаваць яго вучні: А.Я. Камінскі, Д.П. Сергейчук, Ю.Д. Царэвіч, А.В. Пухавая, Ю.Г. Нікалаева, К.І. Шык, В. Монцік, В.Н. Гуцько і іншыя. Такім чынам, ёсць паслядоўнікі П.А. Гуда, якія дзейнічаюць як у калектыве кафедры рэжысуры абрадаў і свят, так і аўтаномна, транслююючы непасрэдна і ў новых формах прынцыпы, закладзеныя заснавальнікам школы.

Пры падрыхтоўцы даклада мы ўзялі інтэрв‘ю ў Пятра Адамавіча. Патынне: азіраючыся на мінулы вопыт, што са сваёй дзейнасці вы лічыце самым важным? ―*Найбольш важная - педагагічная дзейнасць, выхаванне новых аматараў культуры, бо ў іх уся будучыня, усё наперадзе. Увогуле педагагічная дзейнасць настолькі натхніла і мяне, і маіх студэнтаў, вучняў, што ўсе святы, нават спартыўныя, сталі напаўняцца беларускім каларытам, беларускай адметнасцю, беларускімі абрадамі, гульнямі. І пасля гэтага адносіны да беларускай культуры змяніліся ў лепшы бок*” [Інтэрв‘ю з П.А. Гудам].

Што патрэбна сёння маладому рэжысёру, чаму вучыць прафесія рэжысёра таго чалавека, які робіць свята? Адказ: ―*Массавыя святы гэта заўсёды вялікая праца, звязаная з людзьмі, ці то гледачы, ці то твае памочнікі. Рэжысура свят аб'ядноўвае ўсіх гэтых людзей у адзінае цэлае, дзеля таго, каб паказаць і далучыць іх да прыгажосці. Рэжысёру патрэбны веды пра свае традыцыі, цвёрды характар, жалезная дысцыпліна, дабрыня і, абавязкова, любоў да роднай культуры. А рэжысура вучыць любві да народа!*” [Інтэрв‘ю з П.А. Гудам].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што Вы думаеце пра сучасную святочную культуру? ―*Ёсць вялікія здабыткі культуры, адшукана мноства абрадаў малавядомых і невядомых ўвогуле, знойдзена вельмі шмат новых святочных утварэнняў. У кожным раёне ёсць цудоўныя фальклорныя калектывы і фальклярысты, якія даносяць усё да нас*” [Інтэрв‘ю з П.А. Гудам].

Вяртаючыся да тэмы прызнання на ўніверсітэцкім узроўні школы П.А. Гуда ў галіне рэжысуры масавых свят, адзначым асноўныя канцэптуальныя здабыткі заснавальніка школы і яго паслядоўнікаў:

- у 1990-я гады сцвердзіў беларускую народную культуру як каштоўнасны арыентыр прафесіі рэжысёра масавых свят, стварыў якасна новы ўплыў на сістэму сучаснай святочнай масавай культуры;

- распачаў выкладанне тэорыі і методыкі рэжысуры традыцыйных народных свят у БДУКМ, ініцыяваў адкрыццё некалькіх спецыялізацый ―Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў і свят”, ―Рэжысура народных абрадаў і свят”, ―Рэжысура свят”;

- дакладна распрацаваў і ўвасобіў у метадычных працах тэхналогію стварэння масавага свята. Апісаў кожны этап гэтага працэсу (ролю арганізацыйнага камітэта, правілы стварэння прадсвяточнай атмасферы, арганізацыйныя і вытворчыя аспекты архітэктурна-дэкаратыўнага афармлення свята, патрабаванні да тэхнічнага забеспячэння і шмат іншага). Упершыню менавіта П.А. Гуд звярнуў увагу на тыя кампетэнцыі рэжысёра, якія непасрэдна звязаны з эканамічным бокам прафесіі. ―Рэжысёр сёння, - пісаў ён, - выступае не толькі ў якасці творцы, як гэта было раней, але і ў значнай ступені ў ролі арганізатара, эканаміста, адміністратара, які павінен умець суадносіць маштаб творчай задумы з рэаліямі матэрыяльна-тэхнічных і фінансавых сродкаў, выдзеленых на пастаноўку” [2, с. 4].

Яшчэ адной немалаважнай заслугай П.А. Гуда як заснавальніка школы рэжысуры масавых свят з‘яўляецца тое, што ён:

- рэканструяваў, адаптаваў і папулярызаваў на практыцы розныя формы кірмашоў, гульнявыя праграмы і піратэхнічныя кампаненты масавага свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сёняшні дзень Пётр Адамавіч не пакідае беларускую культуру і працы па рэжысуры масавых свят. Ён стварае новыя зборнікі і распрацоўкі, якія стануць вялікай дапапогай студэнтам і работнікам культуры.

1. Гуд, П.А. Народные традиции в современной праздничной культуре Беларуси / П.А. Гуд / Вестник Челябинской государственной академии культуры и искусств. 2008 / 3 (15). – С. 38–44.

2. Гуд, П.А. Тэхналогія стварэння свят. Вучэбны дапаможнік. – Мн. : БДУКМ. 2008 г. – 224 с.

3. Інтэрв‘ю з Пятром Адамавічам Гудам. *З архіва З.В. Запрудскай.* Мінск, сакавік 2018 г.

4. Ліцьвінка, В.Дз. Гуд Пётр Адамавіч. Беларускі фальклор. Энцыклапедыя. Т. 1. – Мн : БелЭн, 2005 г. – С. 373–374.

5. Сінькевіч, Т.А. Гуд Пётр Адамавіч. Культура Беларусі. Энцыклапедыя. Т. 2 – Мн : БелЭн, 2012 г. – С. 293.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Захарова Т.С.,** магистрант
Научный руководитель – Кухто Л.К.

## ПОПУЛЯРИЗАЦИЯ КУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКИХ ИДЕЙ ПАКТА РЕРИХА И ЗНАМЕНИ МИРА ВО ВРЕМЕННОМ КОНТЕКСТЕ МЕЖКУЛЬТУРНОЙ КОММУНИКАЦИИ

15 апреля 1935 года в Вашингтоне в присутствии президента Ф. Рузвельта Соединенными Штатами Америки и 20 странами Латинской Америки был подписан международный Договор об охране художественных и научных учреждений и исторических памятников. (Пакт Рериха). Этот международный договор провозгласил, что ценности культуры независимо от их принадлежности, являются культурным наследием всего человечества.